ресурсов французского языка и культуры, Образовательный центр немецкого языка и культуры, Учебно-научная лаборатория языкознания и лингводидактики Студенческое научное объединение «Социолог», научно-исследовательская лаборатория математического развития, ведет подготовку высококвалифицированных кадров аспирантура и докторантура. В составе МГУ имени А.А. Кулешова успешно работают «Социально-гуманитарный колледж» и «Горецкий педагогический колледж».

За период деятельности университетом было подготовлено свыше 50 тысяч выпускников, среди которых несколько поколений квалифицированных учителей, заслуженных педагогов и отличников образования Республики Беларусь, а также Герои Советского Союза, Герои Социалистического Труда, известные ученые, политики, спортсмены. Среди них – первый Президент Республики Беларусь А.Г. Лукашенко, заместитель главы Администрации Президента А.М. Радьков, Герои Советского Союза Д. Жмуровский, Л. Данилюк, Герой Социалистического Труда М. Зимянин, около 300 заслуженных учителей и отличников просвещения Республики Беларусь, известные поэты и прозаики Э. Волосевич, Н. Горулев, П. Шестериков, олимпийские чемпионы А. Масейков, С. Баитова, О. Менькова и призеры олимпийских игр В. Стрельцов, Д. Наумова, И. Курочкина и В. Колодинская.

**Заключение.** Таким образом, можно сделать вывод, что за 109 лет МГУ имени А.А. Кулешова прошел долгий путь от педагогического института до университета. История Могилевского государственного университета имени А.А. Кулешова отражает те колоссальные изменения, которые он пережил вместе с белорусским обществом за более чем 100-летнюю историю своей деятельности.

1. Агееў, А. Р. Невядомыя старонкі жыцця першага рэктара Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта / А. Р. Агееў // Куляшоўскія чытанні: 11–12 снеж-ня 2003 г.: матэрыялы Міжнароднай навук. канферэнцыі: тэзісы дакладаў: у 2 ч. / отв. ред. М. І. Вішнеўскі. – Могилев: МГУ имени АА. Кулешова, 2004. – Ч. 1. – С. 8–10.
2. Гісторыя Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (1913 – 1940 гг.): дакументы і матэрыялы / аўт. -склад.: А. Р. Агееў, К. М. Бандарэнка, В. П. Клімковіч; пад агульн. рэд. К. М. Бандарэнкі. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2008. – 216 с.
3. Храналогія гісторыі МДУ імя А. А. Куляшова (1913–2018): да 105-годдзя стварэння / аўтар-складальнік А. Р. Агееў; пад агул. рэд. Д. У. Дука. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – 164 с.

## АСАБЛІВАСЦІ ТАПАГРАФІІ ПОЗНЕЛЕДАВІКОВЫХ ПАСЕЛІШЧАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***Гаршкоў А.Д.,***
*аспірант ГрДУ імя Янкі Купалы, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Піваварчык С.А.,*** *доктар гіст. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Тапаграфія, познеледавікоўе, Беларусь, першабытнасць.
Keywords. Topography, late glacial period, Belarus, primitive period.

У познеледавіковы перыяд (14–11,7 тыс. кал. гадоў таму) на тэрыторыі Беларусі вядома, як мінімум, пяць культурных адзінак – гамбургская, броме-лінгбі, валкушанская, свідэрская, грэнская [3, с. 37]. Яшчэ дзве – федэрмесер і арэнсбургская – пад пытаннем [1, с. 93–94]. Нягледзячы на адносна доўгую гісторыю даследавання гэтых культур на тэрыторыі Беларусі, комплексна пытанне тапаграфіі – месцаразмяшчэння стаянак у прасторы, амаль не падымалася. Аднак, як паказваюць даследаванні з тэрыторыі Еўропы, гэты фактар, у сукупнасці з іншымі асаблівасцямі помнікаў, часам дазваляе вызначыць гаспадарчую прыналежнасць той ці іншай стаянкі [4, с. 157].

Мэта працы – вызначыць асаблівасці тапаграфіі познеледавіковых паселішчаў на тэрыторыі Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Намі былі прааналізаваны звесткі аб 333 познеледавіковых помніках, вядомых на дадзены момант на тэрыторыі Беларусі. Усе яны былі падзелены на чатыры катэгорыі ў залежнасці ад тапаграфічнай сітуацыі, дзе стаянкі і месцазнаходжанні размешчаны.

**Вынікі і абмеркаванне.** Падзел помнікаў паводле тапаграфічнай сітуацыі іх месцазнаходжання даў наступныя вынікі: *у вусці ракі або яра* – зафіксаваны 81 помнік або 24,3 % ад агульнай колькасці, *на марэнным узвышшы* – 22 або 6,6 %, *на тэрасе/беразе вадаёма* – 150 або 45 %, *на дзюне* – 80 або 24,1 %.

**Статыстыка тапаграфічнага размяшчэння стаянак познеледавіковага часу на тэрыторыі Беларусі**




Зыходзячы з гэтых дадзеных, мы бачым, што асноўным чынам, познеледавіковыя паселішчы на тэрыторыі Беларусі прымеркаваны да берагоў рэк і азёраў. Аднак, на наш пункт гледжання, гэта можа быць звязана не столькі з асаблівасцямі рассялення старажытнага чалавека, колькі з методыкай палявых даследаванняў. У той жа момант, размяшчэнне ў вусці ракі або яра больш рацыянальна з пункту гледжання тагачаснай палеаэканомікі. Напрыклад, звычайна ў падобных месцах адбывалася паколка паўночных аленяў, здабывалася сыравіна для вырабу прыладаў працы і г. д. Хаця на думку ўкраінскага даследчыка Л. Л. Залізняка, менавіта для палявання тагачасныя людзі сяліліся на берагах рэк і азёр [2, с. 129]. Не выключна, што стаянкі, прыўрочаныя да ледавіковых марэн, звязаны менавіта з крамянёвай сыравінай, якой дастаткова ў падобных адкладах.

Што датычыцца размяшчэння помнікаў на дзюне, то тут трэба разглядаць кожны канкрэтны выпадак паасобку, так як апісанне тапаграфіі давалася не спецыялістамі. Не выключна, што дзюна ва ўяўленні археолага, магла быць калісьці берагам ракі або фрагментам прыруславога вала.

**Заключэнне.** Нягледзячы на ўсе акалічнасці, тапаграфія познеледавіковых паселішчаў звязана з вадаёмамі, што цалкам адпавядае тагачаснай палеаэканоміцы чалавека. Разам з тым, методыка палявых даследаванняў (разведак), апісанне тапаграфіі самімі археолагамі, на наш пункт гледжання, не дазваляе нам канкрэтна вылучыць асаблівасці рассялення (то бок вызначыць, якая з катэгорый пераважае). Гэты факт паказвае на перспектыву правядзення далейшых прац для распрацоўкі дадзенай праблематыкі.

1. Гаршкоў, А. Д. Засяленне беларускай часткі басейна ракі Нёман у познеледавіковы час: новыя даныя і перспектывы даследавання / А. Д. Гаршкоў // Социальные, культурные и коммуникативные практики в динамике общественного развития : сборник научных статей / Учреждение образования "Гродненский государственный университет имени Янки Купалы" ; гл. ред. В. А. Белозорович ; ред. кол.: Н. Л. Улейчик [и др.]. – Гродно : ГрГУ им. Янки Купалы, 2021. – С. 93-101.

2. Зализняк, Л. Л. Охотники на северного оленя Украинского Полесья финального палеолита / АН УССР. Ин-т археологии; отв. ред. В. И. Неприна. – Киев: Наук. Думка, 1989. – 176 с.

3. Калечыц, А. Г. Палеалітычныя помнікі Беларусі: (культурна–храналагічная ідэтыфікацыя крыніц) / А. Г. Калечыц, А. У. Коласаў, В. С. Абухоўкі. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – 323 с.

4. Синицына, Г. В. О миграциях и автохтонном развитии культур финального палеолита на северо-западе Русской равнины / Г. В. Синицына // Проблемы заселения Северо-Запада Восточной Европы в верхнем и финальном палеолите (культурно-исторические процессы) / отв. ред. Г.В. Синицына. – Санкт-Петербург.: ИИМК РАН, 2013. – С. 152–181.